ДУ «ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА»

Аддзел бібліятэказнаўства

# КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

*Інфармацыйнае паведамленне*



КАСТРЫЧНІК

Віцебск 2014

ДУ "ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА"
Аддзел бібліятэказнаўства

# КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

**Кастрычнік**

*Інфармацыйнае паведамленне*

ВІЦЕБСК
2014

УДК 008
ББК 71.41(4Беи–4Вит)
К90

Складальнік *А. М. Васілеўская*
Рэдактар *Н. А. Пугачова*
Адказны за выпуск *Т. М. Адамян*

**Культурнае** жыццё Віцебскай вобласці : кастрычнік : інфармацыйнае паведамленне / ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», Аддзел бібліятэказнаўства ; [склад. А. М. Васілеўская]. – Віцебск, 2014. – 23 с.

Штомесячнае інфармацыйнае паведамленне разлічана на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне.

Прызначана для спецыялістаў інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцаў, выкладчыкаў, студэнтаў і іншых катэгорыяў карыстальнікаў.

© ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», 2014

# КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

## Кастрычнік

*Інфармацыйнае паведамленне*

Складальнік **Васілеўская** Алена Мікалаеўна
Адказны за выпуск Т. М. Адамян
Камп’ютарная вёрстка А. В. Юпатавай

Надрукавана на ксераксе ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна»
210601, г. Віцебск, вул. Леніна, д. 8а
E-mail: metodic@vlib.by, vlib@vlib.by

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2014. – 18 окт. – С. 8.*

*ТЭАТРАЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ*

**3 кастрычніка** ў тэатральнай гасцінай Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Якуба Коласа адбыўся паэтычны вечар “Не запрещай себе мечтать…”, падрыхтаваны навучэнцамі Віцебскага дзяржаўнага каледжа культуры і мастацтваў.

*http://kolastheatre.by/ru*

**17** і **25 кастрычніка** Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Якуба Коласа запрасіў на прэм’еру трагедыі У. Шэкспіра “Ромео и Джульетта”. Пастаноўка – аўтарская работа расійскага рэжысёра, народнага артыста Расіі, прафесара *Валерыя Беляковіча*. У галоўных ролях заняты артысты *Раман Салаўёў, Юлія Цвікі, Яўген Берасneў, Яўген Лук’янаў*, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь *Вячаслаў Грушоў*, заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь *Тамара Скварцова* і інш.

*http://kolastheatre.by/ru*

Гродзенскі абласны драматычны тэатр у **кастрычніку** адкрыў гастролі ў г. Віцебску камедыямі “Рождение” А. Слапоўскага і “Эти свободные бабочки” Л. Герша.



**ЗМЕСТ**

**ПРАДМОВА**……………………………………………………………………4

**ХРОНІКА ПАДЗЕЙ**

Культурнае жыццё Віцебскай вобласці: інфармацыйнае паведамленне……………………………………………………………………..5

## ПРАДМОВА

«Культурнае жыццё Віцебскай вобласці» – штомесячнае інфармацыйнае паведамленне, разлічанае на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне. Выданне можа быць карысным спецыялістам інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцам, выкладчыкам, студэнтам і іншым катэгорыям карыстальнікаў.

Пастаянная рубрыка «Хроніка падзей» уключае тэкставыя вытрымкі і аналітычна перапрацаваную інфармацыю, падрыхтаваную на аснове публікацый з гарадскіх, раённых газет Віцебскай вобласці і іх электронных версій за перыяд з 1 па 31 кастрычніка 2014 года. «Хроніка падзей» таксама ўтрымлівае звесткі, прадастаўленыя Віцебскім АМЦНТ, Браслаўскай, Віцебскай, Гарадоцкай, Лепельскай, Лёзненскай, Міёрскай, Полацкай, Шаркаўшчынскай, Шумілінскай раённымі сеткамі бібліятэк, Віцебскай гарадской сеткай бібліятэк.



*ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА*

З **8 кастрычніка** па **8 лістапада** ў выставачнай зале Віцебскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці была адкрыта для прагляду **абласная выстаўка-конкурс лозапляцення “Лазовы кош-2014”**. Адкрыццё выставы-конкурсу прайшло **8 кастрычніка** з удзелам народнага фальклорнага калектыву “Глейна” з г. Гарадка. Дырэктар Гарадоцкага Дома рамёстваў, член Беларускага Саюза майстроў народнай творчасці *Васіль Паўлавіч Сіманковіч* правёў майстар-клас па лозапляценні. Падчас адкрыцця выставы члены абласнога журы падвялі вынікі конкурсных твораў. Лаўрэатамі I, II і III ступені ў намінацыі “Сучасныя формы і тэхналогіі” сталі: *Валерый Уладзіміравіч Давыдаў* (майстар Музея традыцыйнай культуры г. Браслава), *Таццяна Пятроўна Гаварцова* (майстар Докшыцкага Дома рамёстваў), *Таццяна Рыгораўна Казлова* (майстар Лёзненскага Дома рамёстваў). Лаўрэатамі I, II і III ступені ў намінацыі “Дэкаратыўны выраб, пластыка, мэбля” сталі: *Міхаіл Паўлавіч Гільніч* (майстар Цэнтра рамёстваў і традыцыйнай культуры г. Наваполацка), *Пудаў Уладзімір Мікалаевіч* (майстар Цэнтра рамёстваў і традыцыйнай культуры г. Наваполацка), *Таццяна Валер’еўна Азарава* (майстар Дубровенскага Дома рамёстваў). У намінацыі “Традыцыйныя формы і тэхналогіі” – *Васіль Паўлавіч Сіманковіч* (дырэктар Гарадоцкага Дома рамёстваў і фальклору), *Шаўцова Ірына Анатольеўна* (майстар Лёзненскага Дома рамёстваў), *Святлана Іванаўна Навойчык* (майстар Глыбоцкага Дома рамёстваў).

*Віцебскі АМЦНТ*

*МУЗЫКА*

**14 кастрычніка** ў абласной філармоніі прайшоў першы ў новым сезоне канцэрт арганнай музыкі. У выкананні *Марціна Майера* (Аўстрыя) прагучалі творы І.С. Баха і кампазітараў ХХ стагоддзя.

**22 кастрычніка** ў Віцебскім дзяржаўным музычным каледжы імя І.І. Салярцінскага адбылася прэм’ера новага музычна-асветніцкага праекта “Харавыя вечары”. Такія сустрэчы цяпер будуць праводзіцца кожную трэцюю сераду.

*Дняпроўская праўда (Дуброўна). – 2014. – 15 кастр. – С. 4.*

Памятны знак у гонар “Буквара” Спірыдона Собаля адкрыты ў г. Оршы на тэрыторыі Куцеінскага Свята-Богаяўленскага мужчынскага манастыра. Адкрыццё знака, які ўяўляе сабой тытульны ліст першага беларускага “Буквара”, выкананы ў мармуры і прымацаваны на камені, стала адным з цэнтральных падзей фестывалю “Беларусь праваслаўная”. Кіраўніцтву раёна ўрачыста было перададзена факсімільнае выданне “Буквара”. Аднавіць выданне змаглі спецыялісты Выдавецтва Беларускага Экзархата.

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2014. – 14 окт. – С. 2.*

**28 кастрычніка** ў г. Віцебску на будынку Дзіцячай мастацкай школы па вуліцы Суворава, 3 адбылося адкрыццё мемарыяльнай дошкі мастаку П.В. Масленікаву (аўтар – мінскі скульптар Павел Лук).

### МАСТАЦТВА

*ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА*

**23 кастрычніка** ў Арт-цэнтры Марка Шагала пачала работу выстаўка “Cherchez la femme” мастака *Алега Крошкіна*.

**24 кастрычніка** ў Віцебскім цэнтры сучаснага мастацтва адкрылася экспазіцыя жывапісных работ шаркаўчаніна *Віктара Крука*, прымеркаваная да 65-гадовага юбілею мастака.

У Мастацкім музеі г. Віцебска была прадстаўлена выстаўка работ жывапісца і дызайнера з Латвіі *Нузгара Паксадзе* “Экспрессия”.

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2014. – 28 окт. – С. 2.*

Група віцебскіх мастакоў і дызайнераў з **24** па **26 кастрычніка** пабывала ў Латвіі. Паездка адбылася дзякуючы партнёрскім адносінам паміж Віцебскім цэнтрам сучаснага мастацтва і консульства Латвійскай Рэспублікі ў г. Віцебску. Госці наведалі Даўгаўпілскі Арт-цэнтр імя Марка Роткі, буйнейшую выставачную залу горада, Латвійскую Нацыянальную бібліятэку, азнаёміліся з культурнымі праектамі.

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2014. – 6 нояб. – С. 2.*





## КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

### КУЛЬТУРА

АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ КУЛЬТУРЫ

**4 кастрычніка** Ушаччына святкавала 90-годдзе ўтварэння раёна. У ліку святочных мерапрыемстваў – адкрыццё новага Дома рамёстваў (пераехаў у будынак аддзялення Дэпартамента аховы), святкаванне 45-годдзя Дзіцячай школы мастацтваў, тэатралізаванае прадстаўленне, канцэрт Дубровенскага раённага Дома культуры і інш.

*Патрыёт (Ушачы.). – 2014. – 8 кастр. – С. 1–2.*

**10 кастрычніка** лёзненцы адзначылі 71-шы раз Дзень вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У час святочных мерапрыемстваў адбыўся плац-канцэрт роты ганаровага каравула і ваеннага аркестра мабільнай брыгады, на працягу дня можна было бясплатна наведаць экспазіцыю Лёзненскага ваенна-гістарычнага музея, зазірнуць на тэматычную пляцоўку “Франтавы прывал”, пабываць у “Франтавой бібліятэцы”. У рамках свята прайшлі спартыўна-забаўляльныя праграмы для дзяцей і моладзі, канцэрт “Рэтрахіты” і інш.

**14 кастрычніка** ў аблвыканкаме прайшоў урачысты прыём у гонар **Дня маці**. У гэтым годзе яшчэ 22 жанчыны сталі лаўрэатамі абласной прэміі імя Героя Савецкага Саюза З.М. Тусналобавай-Марчанка.

**17 кастрычніка** ў Віцебскай абласной філармоніі адбылася абласная калегія работнікаў культуры Віцебшчыны. Уручэнне традыцыйных прэмій Віцебскага аблвыканкама праходзіць у канун прафесійнага свята, але на гэты раз цырымонія стала пастскрыптумам да яго і была прымеркавана да 75-годдзя Віцебскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці.

Прэміі аблвыканкама за высокія творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтва былі прысуджаны: лектару-музыказнаўцу абласной

філармоніі *Таццяне Савіцкай*, артысту Беларускага тэатра “Лялька” *Міхаілу Клімчуку*, педагогу Шумілінскай школы мастацтваў *Алене Скарынавай*, дырэктару Варапаеўскага Дома культуры Пастаўскага раёна *Юліі Галяш*, метадысту майстру Глыбоцкага Дома рамёстваў *Святлане Скавырка*, бібліятэкару Язненскай сельскай бібліятэкі Міёрскай ЦБС *Ларысе Карпавай*, кіраўніку Мастацкага музея – філіяла абласнога краязнаўчага – *Вользе Акуневіч* і дырэктару Пастаўскага РДК *Аліне Чарнюк*, прызнаных лепшымі ў сваіх намінацыях.

Лепшыя работнікі таксама адзначаны граматамі Міністэрстваў культуры і адукацыі, абласнога Савета дэпутатаў, Галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі.

Ганаровымі граматамі аблвыканкама і прэміямі былі ўзнагароджаны скульптар *Аляксандр Гвоздзікаў* і *Іван Казак*, дырэктар – мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа *Валерый Анісенка*.

Прыемнай навіной стала прысваенне ганаровага звання “Заслужаны аматарскі калетыў Рэспублікі Беларусь” першаму і адзінаму ў краіне творчаму аб’яднанню – клубу народных майстроў і мастакоў “Скарбонка” Лепельскага РДК.

*Витебские вести. – 2014. – 21 окт. – С. 1.*

У сувязі з Днём работнікаў культуры і юбілеем ДУ “Віцебскі АМЦНТ” (дырэктар *Кацярына Пятроўна Лабука)* установа была ўзнагароджана Ганаровай граматай Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў за вялікі ўклад у развіццё культуры і рэалізацыю сацыяльнай палітыкі, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці Віцебскай вобласці.

Падзяку Міністра культуры Рэспублікі Беларусь за добрасумленную працу, значны ўклад у справу адраджэння і захавання культуры Беларусі атрымала *Алена Дзмітрыеўна Чарных*, вядучы метадыст па тэатральным жанры.

Ганаровай граматай Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў за шматгадовую добрасумленную працу ў галіне культуры, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці, вялікі ўклад у рэалізацыю сацыяльнай і эканамічнай



(*Мішневіцкая сельская бібліятэка*).

**12 кастрычніка** Вечар-канцэрт “Мы ўсім абавязаны маме” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

*МУЗЕЙНАЯ СПРАВА І АХОВА ПОМНІКАЎ*

У **кастрычніку** музей-сядзібу І.Я. Рэпіна “Здраўнёва” наведала дэлегацыя з г. Харкава (Украіна). Госці перадалі ў дар музею рэпрынтнае выданне рэдкай кнігі пра жыццё і творчасць рускага мастака Архіпа Куінджы. Кніга выдадзена ў 1913 годзе і ўключае нарысы вядомага крытыка М. Невядомскага і ўспаміны І.Я. Рэпіна.

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2014. – 30 окт. – С. VI.*

**10 кастрычніка** адбылася ўрачыстая цырымонія перадачы факсімільных выданняў кніжнай спадчыны Францыска Скарыны ў фонды Музейнага комплексу гісторыі і культуры Аршаншчыны. Цырымонія прайшла ў г. Оршы ў рамках фестывалю “Беларусь праваслаўная” і міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі “Куцеінскія чытанні-2014”.

**23 кастрычніка** ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі адкрылася выстаўка калекцыі А. Падліпскага “Жизнь и творчество И.Е. Репина на почтовых открытках”.

*Витебские вести. – 2014. – 1 нояб. – С. 12.*

**23–24 кастрычніка** ў абласным краязнаўчым музеі прайшла VI навукова-практычная канферэнцыя “Витебские древности”. У ходзе канферэнцыі былі абмеркаваны вынікі археалагічных даследаванняў, пытанні сацыяльна-палітычнага, эканамічнага і культурнага развіцця Віцебшчыны з самых старажытных часоў да пачатку XX ст.; пытанні развіцця археалогіі, краязнаўства, мастацтвазнаўства, музеязнаўства і фарміравання музейных калекцый.

У **кастрычніку** ў аграгарадку Ляды Дубровенскага раёна адкрылі на фасадзе будынку сярэдняй школы мемарыяльную дошку у памяць пра земляка жывапісца-партрэтыста *Сяргея Канстанцінавіча Заранку*.

(*Яноўская сельская бібліятэка*) і інш.

***Ушацкая раённая сетка публічных бібліятэк***

Міжнароднаму дню барацьбы жанчын за мір была прысвечана гадзіна краязнаўства “Вядомыя жаночыя імёны нашай бацькаўшчыны”, якая адбылася ў *Вялікадолецкай сельскай бібліятэцы*.

Гадзіна віншаванняў “Маё сэрцайка – для маці!” прайшла ў *Косарскай сельскай бібліятэцы*.

***Чашніцкая раённая сетка публічных бібліятэк***

**3 кастрычніка** Вечар адпачынку “Узрост сумным не бывае” у свята Міжнароднага дня пажылых людзей згуртаваў пад дахам Чашніцкага раённага Дома культуры членаў клубаў “Ветэран” Чашніцкага ГДК, “Родник” Альшанскага СДК і “Гараджанка” *Чашніцкай гарадской бібліятэкі*.

***Шаркаўшчынская раённая сетка публічных бібліятэк***

**3 кастрычніка** Юбілейны бенефіс “Мой лёс – бібліятэка”, прысвечаны 70-годдзю цэнтральнай раённай бібліятэкі.

**31 кастрычніка** ў бібліятэках ЦБС прайшлі мерапрыемствы, прысвечаныя спаленым ў гады Вялікай Айчыннай вайны вёскам раёна: гадзіна ўспамінаў “Руіны гавораць” (*Германавіцкая сельская бібліятэка*), літаратурна-музыкальная кампазіцыя “Жывымі гінулі ў агні” (*Іёдская сельская бібліятэка*), гадзіна смутку “Спаленыя вёскі Шаркаўшчынскай зямлі” (*Каўшэлеўская сельская бібліятэка*).

***Шумілінская раённая сетка публічных бібліятэк***

**1 кастрычніка** Свята да Дня пажылога чалавека “О, восеньскі ўзрост!” (*Дабейская сельская бібліятэка сумесна з Дабейскім сельскім клубам і ААТ “Приозёрный мир”*).

**11 кастрычніка** Фальклорнае свята “Хата з матчынай душой”



палітыкі Віцебскай вобласці ўзнагароджана намеснік дырэктара па аматарскай творчасці і культурна-дасугавай дзейнасці ДУ “Віцебскі АМЦНТ” *Зоя Аляксандраўна Гукава.*

Ганаровай граматай Галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама ўзнагароджаны: загадчык аддзела інфармацыйна-аналітычнай і рэпертуарна-выдавецкай дзейнасці *Святлана Аляксандраўна Кухто,* вадзіцель *Валерый Мяфодзьевіч Альшэўскі*, галоўны бухгалтар *Людміла Уладзіміраўна Юрчанка*, вядучы метадыст *Людміла Уладзіміраўна Вакар.*

ДУ “Віцебскі АМЦНТ” у сувязі з 75-годдзем з дня заснавання ўзнагароджана Віцебскім абласным камітэтам Беларускага прафсаюза работнікаў культуры каштоўным падарункам.

Ганаровай граматай Цэнтральнага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў культуры за шматгадовую працу, высокі прафесіяналізм і ў сувязі з 75-годдзем з дня заснавання ДУ “Віцебскі АМЦНТ” узнагароджана дырэктар установы *Кацярына Пятроўна Лабука.*

Граматамі Віцебскага абласнога камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў культуры ўзнагароджаны: *Ала Міхайлаўна Лялькіна*, вядучы метадыст, старшыня пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі; *Галіна Аляксандраўна Красаўцава*, вядучы метадыст; *Алена Дзмітрыеўна Чарных,* вядучы метадыст; *Ангеліна Анатольеўна Волкава*, сакратар; *Галіна Станіславаўна Курашова*, загадчык гаспадаркі.

У межах святочных мерапрыемстваў адбыўся гала-канцэрт удзельнікаў абласнога конкурсу сярод творчых работнікаў устаноў культуры клубнага тыпу “Клубных спраў майстры”, пераможцамі якога сталі: *Святлана Леанідаўна Дзякун* (г. Глыбокае), *Яўген Віктаравіч Набееў* (г. Браслаў), *Крысціна Іосіфаўна Гмырак* (г. Докшыцы), *Аляксей Эдуардавіч Гайдэль* (г. Міёры), *Людміла Фёдараўна Шыпуля* (г. Лепель), *Антаніна Якаўлеўна Марозава* (г. Дуброўна), *Яна Анатольеўна Талкачова* (г. п. Лёзна), *Юлія Генадзьеўна Галяш* (г. Паставы).

*Віцебскі АМЦНТ*

У **кастрычніку** міністр культуры Рэспублікі Беларус Барыс Святлоў наведаў Віцебск і правёў шэраг сустрэч у калектывах. Так, **22 кастрычніка** калектыву Нацыянальгнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа міністр прадставіў новага дырэктара – *Аляксандра Аляксандравіча Старых*, які да гэтага займаў пасаду намесніка генеральнага дырэктара ААТ “Белшына”. У Цэнтры культуры “Віцебск” міністр правёў цырымонію ўзнагароджання супрацоўнікаў установы за актыўны ўдзел і выдатную падрыхтоўку і правядзенне XXII Міжнароднага фестывалю мастацтваў “Славянскі базар у Віцебску”. Падзякі міністра культуры Рэспублікі Беларусь, граматы і ганаровыя граматы Міністэрства культуры ўручаны васемнаццаці спецыялістам, сярод якіх загадчыкі канцэртнай залы “Віцебск” *Уладзімір Варанецкі*, Інтэрнэт-цэнтра *Вольга Сакалова* (узначальвае фестывальную службу акрэдытацыі), Летняга амфітэатра *Анатолій Васенда*, першы намеснік генеральнага дырэктара Цэнтра культцры “Віцебск” *Алена Серабракова*, гукарэжысёры *Руслан Стаброўскі*, *Сяргей Цвікі* і інш.

У Цэнтры культуры “Віцебск” пад старшынствам міністра культуры Б. Святлова адбылося пасяджэнне аргкамітэта па пытаннях падрыхтоўкі і правядзення XXVII Міжнароднага фестывалю сучаснай харэаграфіі.

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2014. – 4 нояб. – С. 3.*

*КУЛЬТУРНЫЯ СУВЯЗІ*

У пачатку **кастрычніка** беларуская дыяспара латвійскага горада Даўгаўпілс у чацвёрты раз правяла фальклорнае свята “Беларускі кірмаш”. Сёлета яно стала міжнародным фестывалем народнай культуры з назвай “Беларускі кірмаш у Даўгаўпілсе”, удзел у якім узялі самадзейныя калектывы з розных гарадоў Латвіі, Літвы і Беларусі. Нашу вобласць прадстаўляў народны ансамбль песні “На панадворку” Браслаўскага музея традыцыйнай культуры.

*Витебские вести. – 2014. – 21 окт. – С. 5.*



адбылася творчая сустрэча з клубам нацыянальнай кухні, гульні і абрадаў “Традыцыя” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

### *Полацкая раённая сетка публічных бібліятэк*

**1 кастрычніка** да Дня пажылых людзей быў арганізаваны інфармацыйны майстар-клас. Любы зацікаўлены пенсіянер мог атрымаць дапамогу ў электроннай чытальнай зале *цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Ф. Скарыны* ў вырашэнні задач, звязаных з камп’ютарам і інтэрнэтам.

**9 кастрычніка** адбылося адкрыццё выстаўкі фотаконкурсу “Книга и чтение” (*цэнтральная раённая бібліятэка імя Ф. Скарыны*).

**14 кастрычніка** Вечар “Ты одна такая – любимая и родная”, прысвечаны Дню маці (*Багатырская сельская бібліятэка*). Свае віншаванні жанчынам дарылі выканаўца сучаснай песні *Генадзь Каратаеў*, празаік-юмарыст *Міхаіл Шнітко* і інш.

**15 кастрычніка** Вечар паэзіі “Люблю Отчизну я…”, прысвечаны 200-годдзю з дня нараджэння вялікага рускага паэта М.Ю. Лермантава (*Завозерская сельская бібліятэка*).

**27 кастрычніка** Псіхалагічны трэнінг “Психология красивого старения” (*цэнтральная раённая бібліятэкя імя Ф. Скарыны*).

### *Сенненская раённая сетка публічных бібліятэк*

Да Дня пажылых людзей у бібліятэках раёна прайшлі наступныя мерапрыемствы: вечары “Залатая восень жыцця” (*цэнтральная раённая бібліятэка*) і “Чти того, кто немощен и сед, чтобы уважали и тебя на склоне лет” (*Багушэўская гарпасялковая бібліятэка*), урок міласэрнасці “Для тех, кто не считает года” (*Машканская сельская бібліятэка*) і інш.

Да Дня маці ў раёне былі праведзены: гульнёвая праграма “Маці лепшая за ўсіх” (*раённая дзіцячая бібліятэка*), літаратурна-музычныя кампазіцыі “Загляните в мамины глаза” (*Чырвонасельская сельская бібліятэка*) і “Дзякуй, матуля, за сэрца тваё” (*Рулёўшчынская сельская бібліятэка*), літаратурны ранішнік “Сонца Вам і кветак, дарагія мамы”

*бібліятэка*).

**14 кастрычніка** Адкрыццё персанальнай выстаўкі работ навучэнцаў ДШМ у галерэі “Арт-Лепель” “Живёт повсюду красота” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

**23 кастрычніка** Віртуальная вандроўка для людзей з абмежаванымі магчымасцямі “Прогулки по планете: Израиль” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

**28 кастрычніка** Лялечны спектакль з літаратурнай віктарынай “Коцік, Пеўнік і Лісіца” (*дзіцячая бібліятэка*).

***Лёзненская раённая сетка публічных бібліятэк***

**9 кастрычніка** Паэтычная гадзіна “Их строки война рифмовала”, прысвечаная творчасці воінаў-вызваліцеляў г. п. Лёзна (*дзіцячая бібліятэка*).

**24 кастрычніка** Урачыстая вечарына “Юбилей собирает друзей”, прысвечаная 95-гадоваму юбілею цэнтральнай раённай бібліятэкі.

***Міёрская раённая сетка публічных бібліятэк***

Да Дня пажылых людзей у бібліятэках сістэмы былі падрыхтаваны наступныя мерапрыемствы: вечарына “Золотые деньки вашей осени” (*цэнтральная раённая бібліятэка*), тэматычная вечарына “Мае гады – маё багацце” (*Дзісненская гарадская бібліятэка*), конкурсная праграма “Бабушки бывают разные” (*Забалоцкая бібліятэка-клуб*) і інш.

***Пастаўская раённая сетка публічных бібліятэк***

**15 кастрычніка** Мультымедыйная гадзіна “Путешествие в страну Анимация” для вучняў СШ № 2 (*дзіцячая бібліятэка імя У. Дубоўкі*).

**25 кастрычніка** ў рамках пасяджэння клуба па інтарэсах “Сучаснікі” прайшла гутарка “Стравы нашых продкаў. Увазе ўдзельнікаў клуба была прапанавана разгорнутая кніжная выстаўка па беларускай нацыянальнай кухні, відэапрэзентацыя прыгатавання абрадавай стравы,



*Кацярына Суднікава* з г. Оршы стала пераможцай VI карпаратыўнага фестывалю самадзейных творчых калектываў і выканаўцаў даччынных грамадстваў і арганізацый ААТ “Газпрам” “Факел”, які прайшоў у г. Белградзе (Расійская Федэрацыя ). Юная артыстка прызнана лепшай у намінацыі “Эстрадна-цыркавы і арыгінальны жанр”. Акрамя Кацярыны ў ім прыняў удзел яшчэ адзін калектыў з г. Оршы – узорны ансамбль танца “Ві–За–Ві”, які атрымаў дыплом лаўрэата III ступені ў намінацыі “Харэаграфія”.

*Витебские вести. – 2014. – 21 окт. – С. 5.*

На **XX Міжнародным конкурсе дзіцячай і юнацкай творчасці “Роза ветров-2014”** (г. Масква, Расійская Федэрацыя) калектыў ансамбля народных інструментаў “Забава” Віцебскай дзіцячай музычнай школы № 4 пад кіраўніцтвам *Людмілы Базылюк*, які ў кастрычніку быў удастоены звання ўзорнага, заваяваў другую лаўрэатскую прэмію ў намінацыі “Ансамбль малых форм”. Калектыў атрымаў і спецыяльны прыз міжнароднага конкурсу, які праводзіўся ў рамках федэральнай праграмы “Культура Расіі” пры падтрымцы ўрада Масквы і фонда “Русский мир”.

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2014. – 4 нояб. – С. 3.*

З **23** па **24 кастрычніка** ў Даўгаўпілскім Палацы культуры прайшоў VIII Міжнародны дзіцяча-юнацкі конкурс-фестываль цыркавога мастацтва PARAD ALLE. Залаты медаль, а таксама спецыяльны прыз кіраўніка адной з буйнейшых у Еўропе цыркавых школ Вітольда Біркханса са Швецыі прывязла на радзіму з Латвіі юная аршанка, удзельніца студыі “Фантазёры” *Дар’я Башкова*.

*Витебские вести. – 2014. – 13 окт. – С. 24.*

**24–25 кастрычніка** ў г. Смаленску (*Расійская Федэрацыя*) адкрылася V Усерасійская навукова-практычная канферэнцыя, якая ставіла перад сабой мэту абагульнення вопыту даследавання народнага касцюма і шляхоў яго вяртання ў бытавое асяроддзе сучаснага соцыума. У мерапрыемстве прынялі ўдзел творчыя дэлегацыі з г. Парыжа (Францыя), Уладзімірскай вобласці, Арла, Сургута, Смаленска і Смаленскай вобласці,

а таксама прадстаўнікі Віцебскай і Магілёўскай абласцей нашай краіны. У межах канферэнцыі з дакладамі выступілі: дырэктар Лепельскага Цэнтра рамёстваў, кіраўнік заслужанага аматарскага калектыву “Скарбонка” *Алена Барадзейка*, член Беларускага саюза мастакоў народнай творчасці, дырэктар Гарадоцкага Дома рамёстваў і фальклору *Васілій Сіманковіч*, член Беларускага саюза народнай творчасці *Ніна Бабровіч* і намеснік дэкана мастацка-графічнага факультэта ВДУ імя П.М. Машэрава *Галіна Бабровіч*.

*Витебские вести. – 2014. – 6 нояб. – С. 21.*

**КУЛЬТУРНА-АСВЕТНАЯ РАБОТА.**
**САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У СФЕРЫ ВОЛЬНАГА ЧАСУ**

*КЛУБНАЯ СПРАВА*

**1 кастрычніка** ў Шумілінскім раённым цэнтры культуры з нагоды Дня пажылых людзей была арганізавана выстаўка вырабаў самадзейных майстроў “Залатая восень” і выстаўка акварэляў шумілінца Уладзіміра Іванова, народны тэатр прадставіў гледачам камедыйны спектакль “Гутэн таг, я твой вораг”, а добры настрой падарылі выступленні калектываў мастацкай самадзейнасці раёна. У ГДК г. Глыбокае да гэтага свята была прымеркавана канцэртная праграма “Восеньскі настрой”, падрыхтаваная самімі ўдзельнікамі мерапрыемства.

*Веснік Глыбоччыны. – 2014. – 8 кастр. – С. 8.*

Дню маці была прысвечана канцэртная праграма “Рэха добрага настрою!”, што прайшла ў Глыбоцкім ДК. Удзел у мерапрыемстве прынялі трыа народнага ансамбля народнай песні “Крынічанька”, ансамбль выкладчыкаў Глыбоцкай дзіцячай школы мастацтваў “Калейдаскоп”, вакальная студыя “Голдэн смайл”, узорны ансамбль эстраднага танца “ВераНіка”, узорны ансамбль танца “Радасць”.

*Веснік Глыбоччыны. – 2014. – 18 кастр. – С. 4.*

Савет ветэранаў аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па



**21 кастрычніка** Вечар памяці “Жыла між лясоў вёсачка”, прысвечаны вёскам, якія былі спалены фашысцкімі карнікамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Халамерскага сельсавета (*Халамерская сельская бібліятэка*).

**22 кастрычніка** Літаратурная вечарына “Ці знаў хто з вас, браткі, Тараса?” (*Гарадоцкая дзіцячая бібліятэка*).

***Дубровенская раённая сетка публічных бібліятэк***

**14 кастрычніка** Літаратурна-музычная кампазіцыя “Под маминым крылом” (*сельская бібліятэка аграгарадка Баброва з удзелам вакальнай групы “Сияние”*).

**16 кастрычніка** Дабрачыннае мерапрыемства для Дома дзіцяці “Подарим радость детям” (*дзіцячая бібліятэка сумесна з БРСМ і РДК*).

***Браслаўская раённая сетка публічных бібліятэк***

**14 кастрычніка** Паэтычны вянок “Я слаўлю маці светлае імя: вобраз маці ў беларускай паэзіі” (*Відзаўская гарпасялковая бібліятэка*).

**20 кастрычніка** Набат памяці “Над Хатынью колокольный звон” (*дзіцячая бібліятэка*).

**21 кастрычніка** Семінар для бібліятэчных работнікаў раёна на тэму “Бібліятэка як фактар захавання нацыянальнай культуры і краязнаўства” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

**26 кастрычніка** Гадзіна мастацтва па творчасці Ю. Пэна “Портрет на фоне времени” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

***Лепельская раённая сетка публічных бібліятэк***

Да Дня пажылога чалавека ў бібліятэках раёна абыліся наступныя мерапрыемствы: вечар-ушанаванне “О, восеньскі ўзрост!” (*Баброўская сельская бібліятэка-музей Я. Мароза*), тэматычны вечар “Музыка для душы” (*Каменская сельская бібліятэка-музей Т. Кляшторнага*), гадзіна добрых сустрэч “Осень жизни – пора золотая” (*Слабадская сельская*

Еўфрасінні Полацкай, які расказаў пра гісторыю свята, звярнуўся са словамі падтрымкі да маці, якія выхоўваюць дзяцей з праблемамі здароўя. У бібліятэцы да свята была разгорнута экспазіцыя творчых работ, выкананых у розных тэхніках, якія прадставілі дзеці-інваліды.

**16 кастрычніка** Адкрыццё выставы рэпрадукцый "Імя святое Сергій", прысвечанай 700-годдзю з дня нараджэння Сергія Раданежскага (*бібліятэка імя Е. Лось*). Выстаўка арганізавана пры падтрымцы культурна-інфармацыйнага цэнтра "Скарбы свету".

***Верхнядзвінская раённая сетка публічных бібліятэка***

**1 кастрычніка** Вечар "І восень аб'ядналa зноў: любоў, паэзію, сяброў" у рамках раённага агляду-конкурсу на лепшае масавае мерапрыемства (*Дзёрнавіцкая сельская бібліятэка*).

**29 кастрычніка** Семінар бібліятэчных работнікаў раёна "Работа библиотек с социально незащищёнными слоями населения" (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

***Віцебская раённая сетка публічных бібліятэка***

**14 кастрычніка** Паэтычная замалёўка "Милая, родная, мамочка моя", прымеркаваная да Дня маці, на якой чытачы сярэдняга школьнага ўзросту з дапамогай паэтычных твораў складалі партрэт маці (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

**16 кастрычніка** Вечар паэтычнага настрою "Звуки лермонтовских строк", прысвечаны 200-годдзю паэта (*Даўжанская сельская бібліятэка*).

***Гарадоцкая раённая сетка публічных бібліятэк***

**1 кастрычніка** Мерапрыемства да Дня пажылых людзей "Встречи с молодостью" (*Бычыхінская сельская бібліятэка*).

**7 кастрычніка** Сустрэча з мастаком *Барысам Рыгоравічам Балабошкам* (*Прудніцкая сельская бібліятэка*).



справах моладзі Аршанскага райвыканкама арганізаваў у **кастрычніку** для ветэранаў культуры сустрэчу "Не годами ваш возраст измерен, а биением сердца в груди", якая была прысвечана адразу тром святам – Дню пажылых людзей, Дню музыкі і Дню работнікаў культуры. Мерапрыемства прайшло ў ЦРБ імя А.С. Пушкіна. Святочны настрой на вечары ствараў камерны ансамбль скрыпачоў "Кампанелла" ДШМ № 1 (мастацкі кіраўнік І. Ханін).

*Аршанская газета. – 2014. – 30 кастр. – С. 4.*

**2 кастрычніка** ў Летнім амфітэатры адбыўся канцэрт рок-гурта "Машина времени".

Студэнтка 4-га курса ВДТУ *Анастасія Лейкіна* стала пераможцай народнага музычнага шоу тэлекампаніі СТВ "Поющие города-3".

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2014. – 28 окт. – С. 1.*

У **кастрычніку** ў г. Мінску ў Акадэмічным музычным тэатры былі падведзены вынікі II рэспубліканскага конкурсу "Сям'я года-2014". За тытул пераможца змагаліся 7 шматдзетных сямей з усіх абласцей краіны. Дыплом лаўрэата I ступені заваявала сям'я *Аляксандра* і *Таццяны Ніканчукоў* з г. Наваполацка.

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2014. – 28 окт. – С. 1.*

Аркестр барабаншчыц з'явіўся ў Бешанковіцкім РДК, кіруе ім настаўнік ДШМ Ю.У. Рагель.

*http://gztzara.by/ru/issues?art_id=2263*

**21 кастрычніка** ў Халамерскім сельскім клубе адбыўся вечар памяці "Жыла між лясоў вёсачка" вёсак, спаленых фашысцкімі карнікамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Халамерскага сельсавета і не адроджаных пасля вайны.

*http://www.garadvest.by/2014/10/ne-pa%d1%9estali-z-vaennaga-popelu/#more-3288*

*ФЕСТЫВАЛІ, СВЯТЫ, КОНКУРСЫ*

З **17** па **19 кастрычніка** ў г. Віцебску праходзіў **XXVIII гарадскі фестываль-свята аўтарскай песні "Віцебскі лістапад"**, у якім удзельнічалі 30 выканаўцаў. На фінальным канцэрце "Новыя мелодыі" ў Цэнтры культуры "Віцебск" 19 кастрычніка былі аб'яўлены лаўрэаты конкурсу. У намінацыі "аўтар" пераможцам стаў *Юрый Пінчкоўскі* (г. Орша), у намінацыі "аўтар музыкі" – *Дзмітрый Усцінаў* (г. Мінск), у намінацыі "выканаўца" – *Святлана Жук* (г. Пінск).

*http://www.gck.by/2014/10/7289*

Музыканты з Беларусі, Расіі, Германіі, Польшчы, швейцарыі і Румыніі прынялі ўдзел у **XIX Міжнародным фестывалі арганнай музыкі "Званы Сафіі"** ў г. Полацку. Праграма фестывалю разлічана на паўтара месяца: першы канцэрт адбыўся **12 кастрычніка**, а апошнія акорды фестывалю прагучаць **23 лістапада**. Упершыню ў полацкім форуме ўдзельнічаюць заходнегерманскі царкоўны арганіст *Марцін Майер*, нямецкі дуэт *Ёзэф* і *Сюзанна Мільчыцкія*, арганіст з Польшчы *Роберт Грудзень*, а таксама адзін з лепшых арганістаў Харватыі *Эдмунд Андлер-Борыч*.

*БІБЛІЯТЭЧНАЯ СПРАВА*

***Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна***

**7 кастрычніка** Прэзентацыя зборніка навуковых паведамленняў "Исторический календарь мини-проектов «Падбярэзскі куфар»". Матэрыялы зборніка ўключаюць даследаванні гісторыка-культурнай і эканамічнай спадчыны вёскі Падбярэззе Віцебскага раёна, закранаюць пытанні развіцця аграэкатурызму ў рэгіёне.

**28 кастрычніка** ў рамках святкавання 100-годдзя з дня нараджэння народнага мастака Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Паўла Васільевіча Масленікава і ў рамках мастацкага праекта "Вяртанне ў Віцебск" (куратар кандыдат мастацтвазнаўства М. Цыбульскі) у бібліятэцы адбылося адкрыццё мастацкай выстаўкі П. В. Масленікава "Прастора сцэны" і прэзентацыя кніг "Павел Маслеников" і "Павел Маслеников. Художник в зеркале времени" дачкі мастака, доктара мастацтвазнаўства, прафесара, загадчыка кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры БДУКМ Веры Паўлаўны Пракапцовай. На выставе прадстаўлены 10 работ Паўла Васільевіча Масленікава з фондаў Магілеўскага абласнога мастацкага музея імя П. В. Масленікава.



**29 кастрычніка** ў абласной бібліятэцы адбыліся абласныя навуковыя чытанні маладых бібліятэкараў "Пошукавая і даследчая дзейнасць бібліятэк", у якіх прынялі ўдзел спецыялісты і кіраўнікі Віцебскай абласной бібліятэкі, публічных бібліятэк сеткі Міністэрства культуры ў Віцебскай вобласці, бібліятэк вышэйшых навучальных установ г. Віцебска. У ходзе выступленняў і дыскусіі ўдзельнікі абмяркавалі актуальныя пытанні тэарэтычных і практычных аспектаў пошукава-даследчай дзейнасці бібліятэк. Да дня правядзення навуковых чытанняў быў падрыхтаваны і выдадзены зборнік дакладаў маладых бібліятэкараў.

***Віцебская гарадская сетка публічных бібліятэк***

**1 кастрычніка** Літаратурна-музычная вечарына "Закружыла лісце залатое", прысвечаная Міжнароднаму дню пажылых (*бібліятэка імя І. Крылова*).

**9 кастрычніка** Сустрэча з адным з аўтараў кніг серыі "Рассказы Деда Природоведа" *Сяргеем Аляксеевічам Трафімавым* (*бібліятэка імя С. Маршака*).

**14 кастрычніка** Вечарына "Усё на зямлі ад мацярынскіх рук", прысвечаная Дню маці і святу Пакрова Прасвятой Багародзіцы (*бібліятэка імя Я. Купалы*). На свята былі запрошаны дзеці-інваліды ДУ "Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Чыгуначнага раёна" са сваімі маці, адміністрацыя і супрацоўнікі гэтай арганізацыі. На вечарыне прысутнічаў айцец Анатолій – клірык храма імя